# 5. Ступені параўнання прыметнікаў
# Grados de Comparación de Adjetivos

У іспанскай мове якасныя прыметнікі маюць 3 ступені параўнання:

– станоўчую;
– вышэйшую;
– найвышэйшую (якая паказвае самую высокую / нізкую велічыню якасці).

**Вышэйшая** ступень утвараецца з дапамогай слоў
**más** (больш)
**menos** (менш)
і
**tan** (такі, -ая, -ія)
па наступнай схеме:

**más + прыметнік + que** = больш… чым

Tu casa es **más alta que** la casa de Antonio.
Твой дом вышэйшы за дом Антона.

Для ўзмацнення выкарыстоўваецца прыслоўе **mucho**, якое ставіцца перад вышэйшай ступенню.

Mi casa es mucho más alta que la casa de Antonio.
Мой дом шмат вышэйшы за дом Антона.

**menos + прыметнік + que** = менш… чым

Esta calle es menos verde que mi calle.
Гэтая вуліца менш зялёная, чым мая вуліца.

**tan + прыметнік + como** = такі, -ая, -ія (ж) … як

Yo soy tan simpática como tú.
Я такая ж сімпатычная, як ты.

Найвышэйшая ступень мае 2 формы: адносную і абсалютную.
1. Адносная форма ўтвараецца дабаўленнем адпаведнага азначальнага артыкля да вышэйшай ступені:

Es **el más alto**.
Ён самы высокі.

Esta silla es **la menos cómoda**.
Гэтае крэсла найменш зручнае.

Калі перад назоўнікам ужо стаіць азначальны артыкль, то паўтараць яго яшчэ раз у вышэйшай ступені не трэба:

Es **la** lección **más corta**.
Es **la** clase **menos interesante**.

Звярніце ўвагу на прыназоўнік **de**, які ўжываецца ў сказах тыпа:
Esta chica es **la más guapa de** la familia.
Гэтая дзяўчынка самая прыгожая ў сям'і.

2. Абсалютная форма азначае самую высокую / нізкую велічыню якасці без суадносення яе з гэтай жа якасцю ў другога прадмета. Яна ўтвараецца:

– дабаўленнем да прыметніка прыслоўя **muy** (вельмі):

Mi hermano es **muy inteligente**.
Мой брат вельмі (надта) разумны.

– дабаўленнем да прыметніка суфікса **-ísimo**, **-a**, **-os**, **-as** (калі прыметнік заканчваецца на галосную, то галосная перад суфіксам выпадае):

difícil – dificil**ísimo**, azul – azul**ísimo**
interesante – interesant**ísimo**, guapo – guap**ísimo**

Некаторыя прыметнікі маюць дзве формы вышэйшай ступені: звычайную і асаблівую, і, адпаведна, дзве формы найвышэйшай ступені:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **bueno** | - más bueno | = mejor | - el más bueno | = el mejor |
| **malo** | - más malo | = peor | - el más malo | = el peor |
| **grande** | - más grande | = mayor | - el más grande | = el mayor |
| **pequeño** | - más pequeño | = menor | - el más pequeño | = el menor |
| **alto** | - más alto | = superior | - el más alto | = el superior |
| **bajo** | - más bajo | = inferior | - el más bajo | = el inferior |

У прыметнікаў, якія заканчваюцца на -**co** и -**go**, пры ўтварэнні абсалютнай ступені літары **c** і **g** замяняюцца на злучэнні літар -**qu** и -**gu** (для захоўвання вымаўлення):

rico – riquísimo, largo – larguísimo

Выключэнне: anti**g**uo – anti**q**uísimo

У прыметнікаў, якія заканчваюцца на -**z**, пры ўтварэнні абсалютнай ступені літара **z** замяняецца на **c**:

feroz – ferocísimo, feliz – felicísimo

У прыметнікаў, якія маюць дыфтонг у корані альбо канчатку, пры ўтварэнні абсалютнай ступені дыфтонг сцягваецца да простага галоснага:

bueno – bonísimo ( buenísimo)    caliente – calentísimo
nuevo– novísimo    valiente –valentísimo    limpio – limpísimo